

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2022 года*

***БЛАНК ЗАДАННЯЎ***
**11 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1** разлічана не толькі на моўныя веды, але і на эрудыцыю. Запішыце ў правым слупку, насупраць адпаведнай выявы, слова, якое найбольш дакладна называе аб'ект у левым слупку табліцы. Падкрэсліце літару, якой абазначаны націскны гук.

*Максімальная колькасць балаў* – **4**.

**Заданне 2.** З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай граматычнай форме, складзіце шэсць фразеалагізмаў з кампанентамі-прыметнікамі, прыведзенымі ў левым слупку табліцы. Запішыце атрыманыя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *да, лезці, манастыр, на, назоўнік, нітка, прыводзіць, пускаць, разбор, са, свой, статут, у, цвет, шар, як, шыты.*

**Заўвага:** прыметнікі, прыведзеныя ў левым слупку, таксама трэба паставіць у патрэбную граматычную форму.

*Максімальная колькасць балаў* – **6**.

**Заданне 3.** Учытайцеся ўважліва ў гэтыя словы, якія маюць агульнае значэнне 'папярэдняя апрацоўка, ацэнка', але з прычыны гэтага падабенства могуць ужывацца няправільна. Паспрабуйце сфармуляваць значэнне кожнага слова, каб не памыляцца ў яго выкарыстанні.

*Максімальная колькасць балаў* – **6**.



**Заданне 4.** Прачытайце тэкст і сцверджанні да яго. У графе “правільна” табліцы насупраць правільных сцверджанняў пастаўце “плюс”.

*Сёння хіба што глухі не чуў пра Інтэрнэт* ***дзякуючы*** *якому людзі з розных краін і нават кантынентаў могуць камунікавацца, быццам сядзяць у розных пакоях адной кватэры*. Але калі з’явіўся Інтэрнэт?

***Напрыканцы*** 1960-х гадоў камп’ютары былі злучаны тэлефоннай сувяззю, *надышоў час ствараць камп’ютарную* ***сетку***, надышоў час ***Інтэрнэт(а,у)***.

У 1968 годзе амерыканскія вучоныя наладзілі сувязь праз тэлефонныя правады паміж камп’ютарамі навукова-даследчых інстытутаў у розных гарадах ЗША.

21 кастрычніка 1969 года з аднаго камп’ютара ў Каліфарнійскім універсітэце было адпраўлена паведамленне ў камп’ютар, які знаходзіўся ў Масачусетскім універсітэце. Першы ліст, адпраўлены па электроннай пошце, складаўся ўсяго з дзвюх літар. Праз пяць секунд пасля адпраўкі ліста камп’ютар Каліфарнійскага ўніверсітэта “завіс” – сапсаваўся. Аднак у Масачусетскім універсітэце паведамленне атрымалі. Таму 21 кастрычніка 1969 года прынята лічыць днём нараджэння ***Інтэрнэт(а,у)*** *(Паводле Я. Конева).*

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

**Заданне 5.** Размяркуйце прапанаваныя словы па адпаведных слупках табліцы ў залежнасці ад колькасці марфем (улічваючы нулявыя марфемы). Графічна абазначце ўсе марфемы ў словах.

*Максімальная колькасць балаў –* ***8****.*

*Жывы, яе, дакладны, семсот, заўтра, мнагаслоўе, наўзбоч, вадаспад.*

**Заданне 6.** Паводле “Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы”, слова адзін (адна, адно, адны) мнагазначнае і ў адпаведнасці з тым, якое значэнне рэалізуе ў пэўным тэксце, можа адносіцца да розных часцін мовы. Вызначце, якое значэнне мае гэта слова ў наступных прыказках і сказах, узятых з мастацкіх і публіцыстычных твораў, і якой часцінай мовы з’яўляецца.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

1. *Адным* калом плота не падапрэш (прыказка).
2. “То як жа быць? – спытаў Антоні. – Давай, брат, думаць, хоць сягоння ці так ці сяк, каб даць параду і к *аднаму* прыйсці ўжо ладу” (Я. Колас).
3. Хоць гаршком называй, *адно* ў печ не ўстаўляй (прыказка).
4. *Аднаму* льецца, а другому нават не капае (прыказка).
5. Падаў ліст. *Адзін*. Падаў павольна, пакратваўся і пакручваўся, бы развітваючыся з нажылым месцам (І. Пташнікаў).
6. Быў *адзін* з тых летніх дзён, якія бываюць, мусіць, толькі на Беларусі (Я. Маўр).

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Мы пошли дальше. Теперь мне стало еще жутче, чем в темноте. Хорошо знакомые кусты бурьяна казались толпою обступивших нас со всех сторон призраков, тонких и расплывчатых. Пламя факела трепетало с тихим рокотом, длинная тень шедшего впереди Емельяна Ивановича металась то вправо, то влево, а длинные призраки волновались, забегали вперед, падали на землю и быстро убегали назад, исчезая в темноте за моей спиною; иногда они вдруг сдвигались в тесную толпу и покачивались, точно о чем-то сговариваясь между собой *(По А. Куприну)*.

**Заданне 8.** Прачытайце твор Алеся Звонака “Дрозд”. Запоўніце табліцу ў бланку адказаў.

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

Скажу вам — ведаеце што? — ў ядлоўцы
Паміж ялін высокіх і бяроз
Жыў не звычайны балбатун-прамоўца,
А *незвычайна красамоўны* дрозд.

Дзе злёт ці сход, парада ці планёрка,
Дрозд тут як тут, і верны сам сабе.
На дзве гадзіны развядзе гаворку,
Паснуць усе, а ён дзяўбе й дзяўбе!

Шчыглоў, сінічак, іншую драбноту
Кідае ў пот, у дрыжыкі, у сплін
Ён, дзяўбучы адну і тую ж ноту!

Як часта там, дзе спраў на грош адзін,
Мы з-за драздоў губляем шмат гадзін...
Ці не пара на іх завесці квоту?!

**Заданне 9.** Назавіце слупкі табліцы і запоўніце прабелы

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Заданне 10.** Уявіце, што Вы ўкладальнік кніг беларускай літаратуры. Падзяліце пададзеныя ніжэй творы на два зборнікі паводле розных прыкмет (тэматычны прынцып не прымаецца). Творы ў зборніках могуць паўтарацца. Напішыце арыгінальныя назвы Вашых кніг і арыгінальныя анатацыі да іх. На вокладцы першага зборніка неабходна змясціць карціну Марка Шагала “Від з акна”, таму назва першага зборніка павінна суадносіцца з гэтай карцінай (свой выбар патлумачце). У анатацыях укажыце прыкметы, паводле якіх складзены зборнікі, і чаму гэтыя зборнікі будуць карысныя Вашым аднакласнікам.

*Максімальная колькасць балаў – **7**.*

**Пералік твораў:**

1. “Літоўскі хутарок” Максіма Гарэцкага.
2. “О Беларусь, мая шыпшына” Уладзіміра Дубоўкі.
3. “Бондар” Змітрака Бядулі.
4. “Загадка” Янкі Брыля.
5. “Сена на асфальце” Міхася Стральцова.
6. “Бандароўна” Янкі Купалы.
7. “Ты пакліч мяне. Пазаві…” Яўгеніі Янішчыц.
8. “Бывай” Аркадзя Куляшова.
9. “Хмарка” Якуба Коласа.
10. “Санет” (“Замёрзла ноччу шпаркая крыніца…”) Максіма Багдановіча.
11. “Шчасце” Максіма Танка.



**Марк Шагал “Від з акна”**